УДК [94:63](476)“1906/1914”

# СТАЛЫПІНСКІЯ ЗЕМЛЕЎЛАДКАВАЛЬНЫЯ КАМІСІІ Ў СІСТЭМЕ ОРГАНАЎ КІРАВАННЯ ПА РЭАЛІЗАЦЫІ АГРАРНАЙ РЭФОРМЫ Ў БЕЛАРУСІ (1906–1914 гг.)*

UDC [94:63](476)“1906/1914”

# STOLYPIN LAND SETTLEMENT COMMISSIONS IN THE SYSTEM OF GOVERNMENT INSTITUTIONS ON AGRARIAN REFORM IMPLEMENTATION IN BELARUS (1906–1914)

**С. А. Талмачова,**
*кандыдат гістарычных навук, дацэнт кафедры гісторыі Беларусі і славянскіх народаў Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя Максіма Танка*

**S. Talmachova,**
*PhD in History, Associate Professor of the Department of History of Belarus and Slavic Nations, Belarusian State Pedagogical University named after Maxim Tank*

Паступіў у рэдакцыю 16.05.19.

Received on 16.05.19.

У пачатку XX ст. у Расійскай імперыі аграрнае пытанне паўстала з новай сілай. Сялянскае малазямелле, цераспалосіца пры існаванні буйных памешчыцкіх латыфундый абвастралі пазямельныя адносіны. На тэрыторыі Беларусі да гэтага дадаваліся праблемы сервітутаў, неўладкаванасці шэрагу груп сельскага насельніцтва (чыншавікі, аднадворцы, праваслаўныя арандатары) і інш. Першая расійская рэвалюцыя паказала неабходнасць тэрміновага вырашэння зямельнага пытання. Мерапрыемствы, рэалізаваныя ўрадам П. А. Сталыпіна, прывялі да значнага паляпшэння становішча ў вёсцы, мадэрнізацыі сельскагаспадарчага сектара эканомікі. Першым крокам стала стварэнне губернскіх і павятовых землеўладкавальных камісій. У артыкуле паказана месца землеўладкавальных камісій у сістэме мясцовых органаў кіравання па рэалізацыі аграрнай палітыкі самадзяржаўя на тэрыторыі Беларусі ў 1906–1914 гг.

*Ключавыя словы:* павятовыя і губернскія землеўладкавальныя камісіі, земскі начальнік, губернская прысутнасць, землеўладкаванне, набыццё зямлі, сяляне.

At the beginning of the XXth century the agrarian question arose with a new force in the Russian Empire. Peasant shortage of land, strip farming along with large landowner latifundia worsened land relations there. On the territory of Belarus there were also problems of easements and the indeterminate status of a number of groups of rural population (chinsheviks, odnodvortsy, Orthodox tenants), etc. The first Russian revolution showed the necessity for an urgent solution to the land issue. The measures implemented by the government of P. Stolypin substantially improved the situation in villages and modernized the agricultural sector of the economy. The first step was the creation of provincial and district land settlement commissions. The article shows the role of land management commissions on the implementation of the autocracy agrarian policy in Belarus in 1906–1914.

*Keywords:* county and provincial land settlement commissions, land captain, provincial agencies, land settlement, land acquisition, peasants.

У пачатку XX ст. у Расійскай імперыі абвастрыліся пазямельныя адносіны паміж памешчыкамі і асноўнай масай сельскага насельніцтва – сялянамі. Сялянскае малазямелле, цераспалосіца пры існаванні буйных памешчыцкіх латыфундый сталі адной з прычын Першай расійскай рэвалюцыі. На тэрыторыі Беларусі дадавалася нявырашанасць праблемы сервітутаў, неўладкаванасць шэрагу груп сельскага насельніцтва (чыншавікі, аднадворцы, праваслаўныя арандатары) і інш. На парадак дня перад урадам паўстала неабходнасць тэрміновага вырашэння зямельнага пытання. Першым крокам праграмы П. А. Сталыпіна ў гэтым кірунку стала стварэнне землеўладкавальных камісій.

* Артыкул падрыхтаваны ў рамках выканання Дзяржаўнай праграмы навуковых даследаванняў «Эканоміка і гуманітарнае развіццё беларускага грамадства» на 2016–2020 гг. і пры падтрымцы Беларускага рэспубліканскага фонду фундаментальных даследаванняў.

Рэпазіторый БДПУ

У гістарыяграфіі назапашаны вялікі комплекс даследаванняў, прысвечаных рэалізацыі сталыпінскай аграрнай рэформы. Пры гэтым землеўладкавальныя камісіі доўгі час не былі прадметам вывучэння. Цікавасць да іх з'явілася толькі ў позняй савецкай і сучаснай гістарыяграфіі. Аднак у рэчышчы партыйна-класавага падыходу савецкімі аўтарамі яны разглядаліся ў якасці праваднікоў інтарэсаў памешчыкаў і самадзяржаўя. Новыя метадалагічныя падыходы дазволілі сучасным навукоўцам адыйсці ад ранейшых поглядаў, аднак месца землеўладкавальных камісій у сістэме мясцовых органаў кіравання па рэалізацыі аграрнай палітыкі самадзяржаўя на тэрыторыі Беларусі ў 1906–1914 гг. да гэтай пары не вывучана. Таму звяртанне да названай праблематыкі з'яўляецца актуальным.

Павятовыя і губернскія землеўладкавальныя камісіі ствараліся на падставе закона ад 4 сакавіка 1906 г. [1, с. 199–201]. Першапачатковай мэтай іх дзейнасці абвяшчалася аказанне дапамогі Сялянскаму пазямельнаму банку ў вырашэнні задач па палягчэнні набыцця зямлі сялянамі. У Віцебскай губ. у 1906–1907 гг. павятовыя камісіі былі створаны ва ўсіх 11 паветах [2, с. 372]. У Магілёўскай губ. з 21 чэрвеня 1906 па 20 чэрвеня 1907 г. камісіі былі адкрыты таксама ва ўсіх 11 паветах [3, с. 104]. Мінскі губернскі камітэт па справах земскай гаспадаркі 23 мая 1906 г. прыняў рашэнне аб утварэнні землеўладкавальных камісій у шасці з дзевяці паветаў: Бабруйскім, Барысаўскім, Ігуменскім, Мазырскім, Пінскім і Слуцкім. У цэлым да 1 студзеня 1907 г. у 5 паўночна-заходніх губернях былі адкрыты 28 павятовых землеўладкавальных камісій [4, с. 113]. Ствараліся яны і на ўзроўні губерні. Пры гэтым Л. П. Лісінскі і А. Р. Бухавец сцвярджалі, што «толькі ў Гродне губернская землеўладкавальная камісія створана не была; яе функцыі выконвала губернская па сялянскіх справах установа» [2, с. 372]. Аднак з канца 1903 г. губернскія па сялянскіх справах прысутнасці ў Віленскай і Гродзенскай губернях былі ліквідаваны, а да выдання закона ад 29 мая 1911 г. губернскія прысутнасці выконвалі функцыі губернскіх землеўладкавальных камісій не толькі ў Гродзенскай, але і ў Віленскай губ. [5, с. 11; 6, с. 25].

Пасяджэнні губернскіх камісій праходзілі з удзелам губернскага прадвадзіцеля дваранства (старшыня), членаў – памочніка начальніка ўпраўлення земляробства і дзяржаўных маёмасцей, старшыні акруговага суда, старшыні губернскай земскай управы, члена акруговага суда, неадменнага члена губернскай прысутнасці, губернскага каморніка, членаў, выбраных губернскім земскім сходам, члена павятовай землеўладкавальнай камісіі [7, с. 131–132].

У склад павятовых камісій, якія, па сутнасці, праводзілі ўсю землеўладкавальную работу, уваходзілі: павятовы прадвадзіцель дваранства (старшыня), старшыня павятовай земскай управы або яго намеснік, неадменны член камісіі або асоба, якая яго замяшчала, член акруговага суда, земскі начальнік адпаведнай мясцовасці, тры члены па абранні ад павятовага земскага сходу і тры прадстаўнікі ад сялян, якія прызначаліся з ліку кандыдатаў, абраных валаснымі сходамі (арт. 1, п. 1) [1, с. 199–200]. Уключэнне ў склад камісій земскіх начальнікаў было абумоўлена тым, што па сваіх прамых абавязках гэтыя чыноўнікі павінны былі ведаць геаграфічныя і дэмаграфічныя асаблівасці мясцовасці і галоўныя праблемы пазямельных адносін у сваім участку.

Першапачаткова галоўнай задачай землеўладкавальных камісій было «облегчение покупки крестьянами земель» пры дапамозе Сялянскага пазямельнага банка. Акрамя таго, на камісіі ўскладаўся абавязак садзейнічання насельніцтву «к устранению в установленном законом порядке недостатков существующего землевладения и землепользования <…> при непременном сохранении законных прав частных владельцев» [1, с. 199]. Асноўная ўвага была накіравана на дакументальнае замацаванне за сялянамі тых зямельных надзелаў, якія знаходзіліся ў іх карыстанні, на ліквідацыю цераспалосіцы і сервітутаў, што значна перашкаджалі развіццю і прыбытковасці як памешчыцкай, так і сялянскай гаспадаркі і інш.

У цэлым дзейнасць камісій праходзіла ў рамках наступных кірункаў: садзейнічанне сялянам пры куплі зямлі з дапамогай Сялянскага банка; продаж і здача ў арэнду казённай зямлі; адвод зямлі пад адрубы і хутары; дапамога сялянам ў перасяленні на свабодныя землі Сібіры, а таксама ўдзел у заключэнні добраахвотных пагадненняў аб ліквідацыі цераспалосіцы. Павятовыя камісіі высвятлялі сапраўдны кошт набытага Сялянскім банкам маёнтка, праводзілі разбіўку буйных участкаў, арганізоўвалі каморніцкія і меліярацыйныя работы. Камісіі праводзілі ўсе землеўладкавальныя работы пры выдзяленні ўчасткаў пад хутары [7, с. 131].

Работа землеўладкавальных камісій была напрамую звязана з дзейнасцю мясцовых аддзяленняў Сялянскага пазямельнага банка. Рэалізацыя закона ад 4 сакавіка 1906 г. спрыя-

Рэпазіторый БДПУ

ла павелічэнню колькасці сялян, якія жадалі набыць дадатковыя плошчы сельскагаспадарчых угоддзяў пры дапамозе банка. Так, калі з 1893 па 1906 г. у 5 паўночна-заходніх губернях было пададзена 1204 заявы аб набыцці зямлі, то толькі ў 1907 г. – 3260 (з іх 1916 атрымалі дазвол) [4, с. 115].

Для вырашэння пытання аб выдачы пазыкі ад Сялянскага банка землеўладкавальнай камісіі неабходна было падрыхтаваць шэраг дакументаў. Пры гэтым на першым этапе галоўная задача ўскладалася на земскага начальніка, які збіраў звесткі і перадаваў іх са сваім заключэннем на разгляд спецыяльнай камісіі, а яна вырашала пытанне па хадайніцтве. У статыстычных даных адлюстраваны толькі тыя здзелкі, якія завяршыліся набыццём зямлі. Пры гэтым частка з іх па розных прычынах «расстроилась». У прыватнасці, у 1913 г. у Мінскае аддзяленне Сялянскага пазямельнага банка было прадстаўлена 530 пагадненняў з 553 гаспадарамі двароў на набыццё 8422,1 дзес. банкаўскай зямлі з выдачай грашовай пазыкі банкам і 17 – на набыццё 159,2 дзес. без пазыкі. Саветам банка, упаўнаважаным і аддзяленнем банка была дазволена пазыка па 514 здзелках 547 гаспадарам двароў з пазыкай і па 14 здзелках – на 148,4 дзес. зямлі без яе. Адхіленых пагадненняў па набыцці банкаўскай зямлі не было. Пры гэтым яшчэ да разгляду банкам па розных прычынах «расстроились» 33 здзелкі па набыцці 33 гаспадарамі 650,6 дзес. зямлі з банкаўскай пазыкай і 7 здзелак з 118 гаспадарамі двароў па куплі 1845,9 дзес. за кошт уласных сродкаў. Аднак ужо пасля дазволу банкам пазыкі 49 здзелак на 1145,5 дзес. зямлі «расстроились» [8, с. 67–68]. Такім чынам, прадстаўляецца праблематычным дакладна ў лічбах вызначыць аб'ём папярэдняй работы земскіх начальнікаў па падрыхтоўцы дакументаў па хадайніцтвах сялян на набыццё зямлі праз Сялянскі пазямельны банк, але можна сцвярджаць, што ён быў значным.

Усяго ж у 1907–1909 гг. у пяці беларускіх губернях банк выдаў сялянам 5148 пазык для набыцця 183 310 дзес. зямлі, а ў 1910–1912 гг. – 13 394 пазык на 313 549 дзес. У выніку за 1905–1914 гг. сяляне набылі (за вылікам продажу) 998 961 дзес. зямлі [2, с. 382].

У цэлым можна меркаваць, што ад супрацоўніцтва землеўладкавальных камісій з земскімі начальнікамі ў пэўнай ступені залежала паспяховасць набыцця сялянамі зямлі. Зразумела, што плацёжаздольнасць членаў грамады мела асноўнае значэнне. Аднак умеnне даходліва растлумачыць асаблівасці заканадаўства, а таксама юрыдычныя тэрміны пры заключэнні дагавораў з Сялянскім пазямельным банкам, аўтарытэт асобы земскага начальніка таксама мелі важнае значэнне. Так, у 6-м участку Слуцкага павета Мінскай губ. з 1901 па 1914 г. змянілася 5 земскіх начальнікаў. Тут сяляне набылі 489 дзес. Адначасова ў 4-м участку ўвесь гэты час пасаду займаў У. Д. Цвеціновіч, пры якім сяляне набылі звыш 6727 дзес. зямлі [9, арк. 45, 47, 50–50 адв.]. На большай частцы набытай зямлі ствараліся хутары ці адрубы, што спрыяла мадэрнізацыі сельскагаспадарчай вытворчасці, павелічэнню яе прыбытковасці. Такім чынам, землеўладкавальныя камісіі былі непасрэдна звязаны з інстытутам земскіх начальнікаў.

Землеўладкавальныя камісіі сталі адным з асноўных праваднікоў сталыпінскай аграрнай рэформы. Яе рэалізацыя пачалася з выдання ўказа ад 9 лістапада 1906 г. [9, с. 970–974]. У адпаведнасці з ім сяляне атрымалі права ўмацаваць у асабістую ўласнасць сваю частку надзельнай зямлі з пераходам да хутарской ці адрубной гаспадаркі. На тэрыторыі Віленскай, Гродзенскай і часткова Мінскай губерняў існавала падворнае землекарыстанне, але да гэтага часу заканадаўча не быў вызначаны парадак здзяйснення здзелак аб адчужэнні «состоящих в подворном владении участков надельной земли», на якія ўласнікі не мелі асобных актаў на ўладанне [10, с. 970]. У Віцебскай, Магілёўскай губернях і частцы Мінскай губ. пераважала абшчыннае землеўладанне, і менавіта на такія мясцовасці і быў у першую чаргу накіраваны названы закон.

Патрабаванні аб замацаванні ў асабістую ўласнасць часткі абшчыннай зямлі прад'яўляліся грамадзе праз сельскага старасту. На сельскім сходзе абшчыннікі прымалі рашэнне. У станоўчым выпадку грамада на працягу месяца павінна была адвесці ўчасткі, якія паступалі ў асабістую ўласнасць, а ў пэўных выпадках усталяваць памер даплаты за дадатковую зямлю (звыш сярэдняй нормы) і ўмовы карыстання агульнымі ўгоддзямі. Калі ў вызначаны тэрмін грамада не выносіла адпаведнага рашэння, то гаспадар двара мог падаць хадайніцтва земскаму начальніку, які самастойна разбіраў «па сутнасці» ўсе ўзнікшыя спрэчкі і абвяшчаў сваю пастанову (арт. 6) [10, с. 971].

Зацікаўленыя бакі маглі прыносіць скаргі на рашэнні сходаў і земскіх начальнікаў у павятовы з'езд земскіх начальнікаў на працягу 30 дзён. Скаргі на грамадскія прысуды падаваліся праз земскага начальніка, а ён, у сваю чаргу, прадстаўляў іх у павятовы з'езд са сваім

Рэпазіторый БДПУ

заключэннем пасля «папярэдняга даследавання» ўсіх абставін справы на месцы. Абскарджаныя і неабскарджаныя грамадскія прысуды і пастановы земскага начальніка прадстаўляліся на зацвярджэнне павятовага з'езда, рашэнні якога лічыліся канчатковымі. Аднак і на іх можна было падаць скаргу ў губернскую прысутнасць, але толькі ў выпадку перавышэння межаў улады ці яўнага парушэння закона (арт. 9) [10, с. 971–972].

Для адчужэння надзельных зямель у грамадах з падворным землекарыстаннем неабходна было атрымаць дакумент, які пацвярджаў прыналежнасць участка. Гэта маглі быць: «крепостной акт»; «владенная запись», выдадзеная сялянскімі ўстановамі; пастановы агульнаграмадзянскіх ці валасных судоў ці павятовых з'ездаў; зацверджаныя павятовым з'ездам грамадскія прыгаворы ці пастановы земскага начальніка аб замацаванні ўчастка ў асабістую ўласнасць асобных гаспадароў двароў. Земскі начальнік зацвярджаў таксама прысуды сельскіх сходаў аб сапраўднай прыналежнасці ўчастка асобе ў грамадах з падворным землекарыстаннем, а ў дачыненні да сядзібных участкаў – і ў грамадах з абшчынным землекарыстаннем (аддз. II, арт. 2). Да пачатку рэформы ў сялян не было асаблівай неабходнасці ў масавым парадку набываць гэтыя дакументы, таму звярталіся за імі толькі ў рэдкіх выпадках. З 1906 г. колькасць падобных спраў стала значнай. Напрыклад, у Віленскай губ. у адпаведнасці з указам ад 9 лістапада 1906 г. земскія начальнікі зацвердзілі 4068 засведчавальных прысудаў, а па законе 14 чэрвеня 1910 г. – 4883 [16, с. 8]. Пасля гэтага дакументы перадаваліся ў павятовую землеўладкавальную камісію. Пры гэтым, як адзначаў чыноўнік Земскага аддзела МУС К. К. Сцефановіч, на справы па законе ад 9 лістапада 1906 г. пры падворным землеўладанні МУС звяртаў увагу значна менш, чым на тыя, што тычыліся выхаду з абшчыны [11, арк. 13].

Магчымасці і паўнамоцтвы землеўладкавальных камісій, а таксама іншыя законы, звязаныя з рэалізацыяй сталыпінскай аграрнай рэформы, сельскаму насельніцтву павінны былі тлумачыць прадстаўнікі мясцовых устаноў па сялянскіх справах. У прыватнасці, да заканадаўства такога роду адносіліся ўказ ад 9 лістапада 1906 г. аб праве выхаду з абшчыны з уласным зямельным надзелам (магчымасці замацавання надзельнай зямлі ў прыватную ўласнасць); закон ад 15 лістапада 1906 г., які дазваляў выдачу Сялянскім банкам пазык пад залог надзельных земляў і інш. [12, с. 3]. У 1909 г. чыноўнік Земскага аддзела МУС К. К. Сцефановіч адзначаў, што некаторыя земскія начальнікі самі не ведалі заканадаўства 9 лістапада 1906 г. і таму не маглі патлумачыць яго сялянам і такім чынам значна тармазілі справу землеўладкавання [13].

Такім чынам, землеўладкавальныя камісіі былі непасрэдна звязаны з інстытутам земскіх начальнікаў. Яны ўяўлялі сабой галоўныя рычагі, з дапамогай якіх царскі ўрад меркаваў вырашыць актуальныя аграрныя пытанні. З прычыны гэтага камісіі валодалі шырокім колам абавязкаў і паўнамоцтваў, што дазваляла ім рэалізоўваць землеўладкавальныя праекты ўсебаковай накіраванасці. Пры гэтым вялікая падрыхтоўчая работа ўскладалася менавіта на земскага начальніка. У цэлым можна казаць, што ні адна справа па землеўладкаванні не абыходзілася без актыўнага ўдзелу гэтых чыноўнікаў.

Эфектыўнасць работы земскіх начальнікаў па рэалізацыі сталыпінскай аграрнай рэформы ў справе землеўладкавання можна вызначыць па наступных лічбавых даных. У Віленскай, Гродзенскай і Мінскай губернях пераважала падворнае землекарыстанне, а ў Віцебскай і Магілёўскай – абшчыннае. З гэтай прычыны даныя аб замацаванні зямлі ў асабістую ўласнасць з 9 лістапада 1906 па 1 студзеня 1913 г. у звестках МУС прыведзены толькі па апошніх дзвюх. Да 1 студзеня 1913 г. тут 110 841 гаспадар двара канчаткова замацаваў 866 442 дзес. зямлі ў асабістую ўласнасць, і абвясцілі патрабаванні аб умацаванні зямлі 119 253 гаспадары [14, арк. 23]. Патрабаванне аб выдачы засведчавальных актаў абвясцілі 785 грамад і паселішчаў з 17 503 гаспадарамі двароў на плошчы ў 110 062 дзес. зямлі. Зацверджана было актаў для 723 грамад і паселішчаў з 15 520 гаспадарамі. Адначасова 6945 асобных гаспадароў абвясцілі патрабаванні аб выдачы ім засведчавальных актаў на плошчы 37 336 дзес., з іх зацверджана 4893 акты [14, арк. 23 адв.]. У прыведзеныя лічбы не ўвайшлі даныя, напрыклад, па Віленскай губ. А тут, па звестках губернскай прысутнасці, земскімі начальнікамі губерні адпаведна ўказу 9 лістапада 1906 г. было зацверджана 658 рашэнняў валасных судоў, якімі прызнаны былі права ўласнасці за асобнымі гаспадарамі двароў на 37 790 дзес. зямлі. На падставе закона ад 14 чэрвеня 1910 г. да 1 верасня 1913 г. у Віленскай губ. земскія начальнікі зацвердзілі 4883 засведчавальныя прысуды і 282 пастановы аб прызнанні права ўласнасці на 29 771 дзес. зямлі [6, с. 8].

Узаемадзеянне землеўладкавальных камісій і земскіх начальнікаў адлюстроўваецца

Рэпазіторый БДПУ

і ў сферы землеўладкавання. Па даных МУС, колькасць земскіх начальнікаў, якія ўдзельнічалі ў землеўладкавальных работах, паступова ўзрастала. Так, у цэлым у 43 губернях Расійскай імперыі прымалі ўдзел у землеўладкаванні ў 1907 г. каля 100 чал., у 1908 г. – 119, у 1909 г. – 535, у 1910 г. – 995, у 1911 г. – 1216, у 1912 г. – каля 2/3 усяго складу земскіх начальнікаў, а ў 1913–1914 гг. колькасць гэта павялічылася [15, арк. 33]. У пяці паўночна-заходніх губернях у палявы перыяд 1911 г. земскім начальнікам была даручана першапачатковая падрыхтоўка землеўладкавальных спраў на плошчы 45 433 дзес. (330 паселішчаў з 5050 дварамі). У рэалізацыі гэтых работ прынялі ўдзел 98 чыноўнікаў (36,2 %) з агульнай колькасці 271 чал. Найбольш актыўна ўдзельнічалі земскія начальнікі Магілёўскай губ. – 86,5 % (45 з 52 чал.) [14, арк. 25–27].

Работу землеўладкавальных камісій немагчыма аддзяліць ад дзейнасці губернскіх прысутнасцей. Так, агульнае кіраўніцтва землеўладкаваннем у Віленскай губ. ажыццяўлялася ў губернскай прысутнасці пераважна неадменнымі членамі прысутнасці. Гэтае новае кола абавязкаў значна ўскладніла дзейнасць апошніх, якія павінны былі кіраваць справаводствам і падрыхтоўкай справаздач па землеўладкаванні. Таму ў 1908 г. для выканання абавязкаў неадменнага члена прысутнасці па справах землеўладкавання быў прызначаны чыноўнік асобых даручэнняў Галоўнага ўпраўлення землеўладкавання і земляробства. З гэтага часу землеўладкавальнае справаводства было выдзелена ў асобнае, а пасля выдання закона ад 29 мая 1911 г. былі адкрыты Віленская і Гродзенская губернскія землеўладкавальныя камісіі [6, с. 25]. Да гэтага часу функцыі губернскіх землеўладкавальных камісій тут выконвалі губернскія прысутнасці [5, с. 11].

З адкрыццём землеўладкавальных камісій дзейнасць земскіх начальнікаў набывала больш азначаную форму, але ўлічыць усе іх намаганні ў канкрэтных лічбах не ўяўляецца магчымым. У прыватнасці, у рабоце земскіх начальнікаў у гэтым кірунку можна вызначыць два бакі. Па-першае, гэта тыя работы, якія выконваліся ўсімі названымі чыноўнікамі ў якасці прамых абавязкаў па пасадзе: засведчанне прысудаў, збіранне ўладальнікаў у парадку арт. 67 «Положения о землеустройстве» і ўдзел у рабоце землеўладкавальнай камісіі па справах свайго ўчастка. З другога боку, можна вызначыць іх дзейнасць як членаў землеўладкавальных камісій – гэта даручэнне ім падрыхтоўкі спраў і выкананне апошніх у якасці землеўпарадкавальніка. Справы такога кшталту ўскладаліся пераважна на тых земскіх начальнікаў, якія праявілі выключную ініцыятыву ці асаблівую цікавасць да работы.

У Віленскай губ. у першыя месяцы існавання землеўладкавальныя камісіі ў 1906–1907 гг. былі заняты арганізацыйнай работай. Таму ў 1906 г. адбыліся толькі 4 даручэнні земскім начальнікам. У 1907 г. колькасць даручэнняў павялічылася да 25 [6, с. 25]. У 1908 г. пачалося складанне планаў землеўладкавальных работ, і з гэтага часу ўдзел у іх земскіх начальнікаў можна вызначыць у лічбах. У адпаведнасці з планам Віленскай губ. на 1908 г. гэтым чыноўнікам было даручана кіраўніцтва ўнутрынадзельным землеўладкаваннем на плошчы ў 2028 дзес., ці 6,4 % агульнай плошчы, вызначанай для землеўладкавання. З 1910 г. удзел земскіх начальнікаў у землеўладкаванні значна ўзрос, на што паўплываў закон 29 мая 1911 г., які надаў дзейнасці землеўладкавальных камісій больш акрэслены характар [16, с. 453–471; 6, с. 25]. Так, у 1910 г. на земскіх начальнікаў Віленскай губ. было ўскладзена кіраўніцтва землеўладкавальнымі работамі на плошчы ў 3161 дзес. (7,7 % агульнай плошчы землеўладкавальных работ), а ў 1913 г. – 6060 дзес. (22,4 %) [6, с. 26].

У Гродзенскай губ. у 1913 г. першапачатковую падрыхтоўку спраў землеўладкавальных камісій ажыццяўлялі 42 земскія начальнікі, якім была даручана 201 справа (232 паселішчы з 11 219 дварамі на плошчы ў 81461,1 дзес.). Усяго ж у гэтых паселішчах было 12 164 двары з плошчай зямлі ў 98 122 дзес. Такім чынам, у 232 паселішчах землеўладкаваннем было ахоплена 92,2 % двароў на 83,0 % агульнай плошчы [15, арк. 19–20 адв.]. З гэтай колькасці 91 справа была падрыхтавана земскімі начальнікамі і прадстаўлена ў павятовыя землеўладкавальныя камісіі для ўключэння ў план работ. Па іх уладкоўвалася ў 102 паселішчах 4966 двароў з плошчай у 33 091,1 дзес. [15, арк. 19–20 адв.]. Такім чынам, актыўная дзейнасць земскіх начальнікаў прыводзіла і да больш высокіх вынікаў іх працы ў справе падрыхтоўкі землеўладкавання.

Наступным этапам было непасрэднае землеўладкаванне. У якасці землеўладкавальнікаў прызначаліся толькі найбольш падрыхтаваныя і аўтарытэтныя земскія начальнікі. Так, у Гродзенскай губ. з 50 усіх чыноўнікаў толькі 14 (у тым ліку 12 у беларускіх паветах) у 1913 г. было даручана землеўладкаванне [15, арк. 21–22]. Пры гэтым частка спраў была ўключана ў план на 1913 г., а іншыя – на больш позні тэрмін [15, с. 78–79].

Рэпазіторый БДПУ

Земскія начальнікі Магілёўскай губ. шырока прыцягваліся не толькі да падрыхтоўкі, але і для непасрэднай рэалізацыі землеўладкавання. Так, у 1914 г. 35 земскіх начальнікаў атрымалі 64 заданні на землеўладкаванне 341 зямельнай адзінкі на 23 090 дзес. зямлі для 2045 двароў. Гэта склала 24,3 % ад усёй плошчы землеўладкавання ў губерні (94 929 дзес.). Пераважная большасць спраў заключалася ў ліквідацыі цераспалосіцы і развярстанні на хутарскія ўчасткі [17, с. 2–83]. Такая работа патрабавала ад земскага начальніка добрага ведання мясцовых асаблівасцей глебы, а таксама аўтарытэту ў вачах і сялян, і мясцовай адміністрацыі. Усяго ж у Магілёўскай губ. з часу адкрыцця камісій да 1 студзеня 1914 г. былі праведзены землеўладкавальныя работы ў 1569 паселішчах на плошчы ў 316 992 дзес. зямлі для 29 928 двароў. З гэтай колькасці ў 1498 паселішчах былі створаны 25 703 хутарскія і адрубныя гаспадаркі на плошчы 273 368 дзес. зямлі. Групавое землеўладкаванне адбылося ў 71 паселішчы губерні (4225 двароў на 43 625 дзес.) [18, с. 81].

У цэлым за перыяд з 9 лістапада 1906 па 1 студзеня 1914 г. у асабістую ўласнасць 21 014 гаспадароў двароў Віцебскай губ. і 90 489 гаспадароў Магілёўскай губ. было замацавана 153 855 і 701 680 дзес. надзельнай зямлі адпаведна. Гэта складала 84,8 і 96,9 % ад агульнай колькасці гаспадароў двароў, якія падалі хадайніцтвы на ўмацаванне надзельнай зямлі [19, с. 647]. Да канца 1914 г. у землеўладкавальныя камісіі Віцебскай, Мінскай і Магілёўскай губерняў было прадстаўлена «законченных в натуре землеустроительных проектов» па развярстанні ўгоддзяў на адрубы для 79 976 гаспадароў двароў на 849 283 дзес. зямлі. Пры гэтым праекты для 66 805 гаспадароў двароў на 708 563 дзес. зямлі былі зацверджаны і рэалізаваны [19, с. 670].

Аднак супрацоўніцтва паміж землеўладкавальнымі камісіямі і мясцовымі органамі дзяржаўнага кіравання, створанымі для рэалізацыі аграрнай палітыкі дзяржавы, не заўсёды было адназначным. Так, Гродзенскі губернатар В. М. Шабека у 1914 г. адзначаў існаванне недаверу да земскіх начальнікаў з боку неадменных членаў землеўладкавальных камісій, а таксама «ведомственное стремление чинов Главного управления землеустройства по возможности удержать это огромной важности дело в своих руках». Для паспяховай рэалізацыі ўрадавай палітыкі губернатар лічыў неабходнай сумесную працу неадменных членаў землеўладкавальных камісій з інстытутам земскіх начальнікаў [15, арк. 77–77 адв.].

Міністр унутраных спраў М. Маклакоў у цыркуляры ад 14 мая 1914 г. яшчэ раз нагадваў, што своечасовае выкананне землеўладкавальных даручэнняў «должно составлять одну из первейших служебных обязанностей земских начальников, при чем какое бы то ни было, без законных к тому оснований, промедление по сим делам, а особливо в проверке приговоров, поступающих к ним, на основании ст. 20 Положения о землеустройстве, является отнюдь недопустимым» [15, арк. 205].

Асобным напрамкам дзейнасці землеўладкавальных камісій была арганізацыя перасяленняў у Сібір і на Далёкі Усход на свабодныя землі. У гэтым кірунку работа камісій была таксама непасрэдна звязана з мясцовымі ўстановамі па сялянскіх справах. Так, менавіта апошнія інфарміравалі сельскае насельніцтва «со всеми законами, правилами и льготами по ходачеству и переселением, а также с порядком распоряжения земельным имуществом на родине» [6, с. 21]. 7 снежня 1912 г. Віленскі губернатар выдаў цыркуляр, у якім прапанаваў земскім начальнікам «употребить все средства к точному выполнению намеченных мер по надлежащей постановке переселенческого движения». Губернатар адзначаў важнасць асабістага ўдзелу земскіх начальнікаў пры тлумачэнні насельніцтву льгот, якія прадстаўляліся перасяленцам ад дзяржавы, правілаў перасялення і інш.

Па справах аб перасяленні сялян у Сібір і на Далёкі Усход на казённыя землі мясцовыя ўстановы кіраваліся законам ад 13 ліпеня 1889 г. [20, с. 535–538] і цыркулярам МУС ад 20 студзеня 1897 г. У адпаведнасці з апошнім, хадайніцтвы аб перасяленні вырашаліся губернскай прысутнасцю. Земскія начальнікі збіралі неабходныя звесткі па хадайніцтвах, выдавалі хадачаскія, перасяленчыя і тарыфныя пасведчанні на льготны праезд па чыгунках [6, с. 21]. З пачаткам сталыпінскай рэформы перасяленні сталі ажыццяўляцца на падставе «Высочайше утвержденных временных правил о добровольном переселении сельских обывателей и мещан-землевладельцев» ад 6 чэрвеня 1904 г. [21, с. 603–607] і ўказанняў Перасяленчага ўпраўлення. Правілы ўскладалі на земскіх начальнікаў вырашэнне хадайніцтваў і выдачу вышэйназваных дакументаў асобам, што перасяляліся ў межах Еўрапейскай Расіі на землі, якія набываліся пры пасрэдніцтве Сялянскага пазямельнага банка. Віленскі гу-

Рэпазіторый БДПУ

бернатар адзначаў значную работу земскіх начальнікаў па інфармiраваннi насельніцтва і службовай перапісцы па справах перасялення [6, с. 22]. Па падліках К. Ю. Тарановіч, за 1906–1914 г. у пяці беларускіх губернях было выдадзена дакументаў на перасяленне больш за 352 тыс. чал., з якіх 333 379 былі сямейнымі і 14 435 адзінокіх. Па перасяленчых пасведчаннях на Далёкі Усход і ў Сібір рухалася 301 381 чал. (85 %). Астатнія 15 % накіроўваліся самавольна [22, арк. 157]. Усяго ж у 1907–1914 гг. у Сібір і на Далёкі Усход з пяці беларускіх губерняў перасялілася 335 369 чал. Найбольшая колькасць з іх выехала з Магілёўскай губ. – 159 074 чал. (47,4 %), а найменшая – з Гродзенскай – 13 566 чал. (4,0 %) [2, с. 403].

Такім чынам, землеўладкавальныя камісіі займалі цэнтральнае месца ў правядзенні сталыпінскай аграрнай рэформы. Пры гэтым паспяховасць іх дзейнасці напрамую залежала ад узаемадзеяння з іншымі органамі мясцовага кіравання, якія былі створаны для рэалізацыі ўрадавых мерапрыемстваў у дачыненні да сельскага насельніцтва – губернскімі прысутнасцямі, земскімі начальнікамі і іх павятовымі з'ездамі. Губернскія і павятовыя землеўладкавальныя камісіі арганічна ўвайшлі ў структуру мясцовых органаў дзяржаўнага кіравання па рэалізацыі аграрнай палітыкі самадзяржаўя ў Беларусі. Менавіта гэта дало магчымасць станоўча выконваць пастаўленыя перад імі задачы ў 1906–1914 гг.


Літаратура

1. Именной Высочайший указ, данный Сенату. – Об учреждении: а) Комитета по землеустроительным делам при Главном управлении землеустройства и земледелия и б) губернских и уездных землеустроительных комиссий и об упразднении Комитета по земельным делам // ПЗСРИ. – Собр. 3-е : в 33 т. – Т. 26 (1906). – № 27478. – С. 199–201.
2. Гісторыя сялянства Беларусі са старажытных часоў да нашых дзён : у 3 т. – Т. 2 : Гісторыя сялянства Беларусі ад рэформы 1861 г. да сакавіка 1917 г. / З. Е. Абезнаўз [і інш.] ; пад рэд. В. П. Панюціча. – Мінск : Беларус. навука, 2002. – 552 с.
3. Обзор Могилевской губернии за 1907 год : прил. к всеподданнейшему отчету. – Могилев на Днепре : Могилев. губ. стат. ком., 1908. – [6], 106, [164] с.
4. *Жытко, А. П.* Дзейнасць землеўпарадкавальных камісій па рэалізацыі Сталыпінскай аграрнай рэформы / А. П. Жытко, С. А. Талмачова, К. Ю. Тарановіч // Дзяржаўнае кіраванне і грамадскае самакіраванне на тэрыторыі Беларусі (канец XVIII – пачатак XX ст.) : вучэб.-метад. дапам. / А. П. Жытко [і інш.] ; пад агул. рэд. А. П. Жытко. – Мінск : БДПУ, 2017. – 320 с.
5. Краткий очерк за десятилетие : 1906–1916 / Ком. по землеустроительным делам. – Петроград : Т-во Р. Годике и А. Вильборг, 1916. – 62, VII, [10] с.
6. Навукова-даведачная бібліятэка РДГА. Друкаваная запіска 14926. Краткий обзор десятилетней деятельности крестьянских учреждений Виленской губернии, преобразованных по закону 12 июля 1889 года (1 декабря 1903 – 1 декабря 1913) / сост. Виленским губернским присутствием. – Вильна : Губернская типография, 1913. – 37 с.
7. *Жытко А. П.* Структура і функцыі органаў мясцовага дзяржаўнага кіравання / А. П. Жытко [і інш.] // Грамадска-палітычнае жыццё ў Беларусі, 1772–1917 гг. / А. У. Унучак [і інш.] ; рэдкал.: В. В. Даніловіч (гал. рэд.) [і інш.] ; Нац. Акад. навук Беларусі, Ін-т гісторыі. – Мінск : Беларус. навука, 2018. – 573 с.
8. Обзор Минской губернии за 1913 год / Издание Минского губернского статистического комитета. – Минск, 1914. – [3], 72, [53] с.

References

1. Imennoy Vysochayshiy ukaz, dannyy Senatu. – Ob uchrezhdenii: a) Komiteta po zemleustroitelnym delam pri Glavnom upravlenii zemleustroystva i zemledeliya i b) gubernskikh i uyezdnykh zemleustroitelnykh komissiy i ob uprazdnenii Komiteta po zemelnym delam // PZSRI. – Sobr. 3-ye : v 33 t. – T. 26 (1906). – № 27478. – S. 199–201.
2. Gistoryya syalyanstva Belarusi sa starazhytnykh chasou da nashykh dzyon : u 3 t. – T. 2 : Gistoryya syalyanstva Belarusi ad reformy 1861 g. da sakavika 1917 g. / Z. Ye. Abeznauz [i insh.] ; pad red. V. P. Panyutsicha. – Mínsk : Bel. navuka, 2002. – 552 s.
3. Obzor Mogilevskoy gubernii za 1907 god : pril. k vsepoddanneyshemu otchetu. – Mogilev na Dnepre : Mogilev. gub. stat. kom., 1908. – [6], 106, [164] s.
4. *Zhytko, A. P.* Dzeynasts zemleuparadkavalnykh kamisiy pa realizatsyi Stalypinskay agrarnay reformy / A. P. Zhytko, S. A. Talmachova, K. Yu. Taranovich // Dzyarzhaunaye kiravanne i gramadskaye samakiravanne na terytoryi Belarusi (kanets XVIII – pachatak XX st.) : vucheb.-metad. dapam. / A. P. Zhytko [i insh.] ; pad agul. red. A. P. Zhytko. – Mínsk : BDPU, 2017. – 320 s.
5. Kratkiy ocherk za desyatiletiye : 1906–1916 / Kom. po zemleustroitelnym delam. – Petrograd : T¬vo R. Godike i A. Vilborg, 1916. – 62, VII, [10] s.
6. Navukova-davedachnaya bibliyateka RDGA. Drukavanaya zapiska 14926. Kratkiy obzor desyatiletney deyatelnosti krestyanskikh uchrezhdeniy Vilenskoy gubernii, preobrazovannykh po zakonu 12 iyulya 1889 goda (1 dekabrya 1903 – 1 dekabrya 1913) / sost. Vilenskim gubernskim prisutstviyem. – Vilna: Gubernskaya tipografiya, 1913. – 37 s.
7. *Zhytko, A. P.* Struktura i funktsyi organau myastsovaga dzyarzhaunaga kiravannya / A. P. Zhytko [i insh.] // Gramadska-palitychnaye zhytstso u Belarusi, 1772–1917 gg. / A. U. Unuchak [i insh.] ; redkal.: V. V. Danilovich (gal. red.) [i insh.] ; Nats. Akad. navuk Belarusi, In-t gistoryi. – Minsk : Belarus. navuka, 2018. – 573 s.
8. Obzor Minskoy gubernii za 1913 god / Izdaniye Minskogo gubernskogo statisticheskogo komiteta. – Minsk, 1914. – [3], 72, [53] s.


Рэпазіторый БДПУ

9. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (НГАБ). – Ф. 1595. Воп. 1. Спр. 85.
10. Именной Высочайший указ, данный Сенату. – О дополнении некоторых постановлений действующего закона, касающихся крестьянского землевладения и землепользования // ПСЗРИ. – Собр. 3-е : в 33 т. – Т. 26 (1906). – № 28528. – С. 970–974.
11. РДГА. – Фонд 1291. Воп. 31, 1908. Спр. 6. Дело по ревизионным письмам д.с.с. Константина Константиновича Стефановича за 1908 год.
12. Акт ревизии, произведенной Пинским уездным предводителем дворянства И. А. Папа-Афанасопуло во втором земском участке Пинского уезда 5–7 и 16, 17, 26, 27 августа 1908 года. – [Минск, 1908].
13. РДГА. – Фонд 1291. Воп. 122, 1909 г. Спр. 38. Дело о командировке помощника Управляющего Земским отделом Действительного статского советника Стефановича в Виленскую, Лифляндскую и Минскую губернии для обревизования крестьянских учреждений.
14. Расійскі дзяржаўны гістарычны архіў (РДГА). – Фонд 1278. Воп. 6. Спр. 456. Дело по законопроекту Министерства внутренних дел, внесенному в Государственную Думу Четвертого созыва, об увеличении окладов содержания начальников и непременных членов губернских и губернских по крестьянским делам присутствий.
15. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі у г. Гродна. – Фонд 18. Воп. 1. Спр. 1797. Дело об участии земских начальников в ходе землеустройства крестьян Гродненской губернии.
16. Высочайше утвержденный одобренный Государственным Советом и Государственной Думой закон. О землеустройстве // ПСЗРИ. Собр. 3-е : в 33 т. – Т. 31 (1911) – Ч. 1. № 35370. – С. 453–471.
17. План землеустроительных работ на полевой период 1914 года: Могилевская губерния : в 3 ч. – Ч. 1: Дела в порядке Положения о землеустройстве, назначенные к землемерному исполнению. – Могилев-на-Днепре : Типо-литография Я. Н. Подземского, [1914]. – 83 [10] с.
18. Обзор Могилевской губернии за 1913 год / Могилев. губ. стат. комитет. – Могилев на Днепре, 1915. – VI, 91, [137] с. : табл.
19. Документы и материалы по истории Белоруссии : в 4 т. Т. 3 : 1900–1917 гг. / Акад. наук Белорус. ССР. Ин-т истории ; под ред. действ. чл. АН БССР В.Н. Перцева [и др.]. – Минск : Изд-во Акад. наук БССР, 1953. – 1020 с.
20. Высочайше утвержденное мнение Государственного совета. О добровольном переселении сельских обывателей и мещан на казенные земли и о порядке перечисления лиц означенных сословий, переселившихся в прежнее время // ПСЗРИ. Собр. 3-е : в 33 т. – Т. 9 (1889). – № 6198. – С. 535–538.
21. Высочайше утвержденные временные правила о добровольном переселении сельских обывателей и мещан-землевладельцах. Мнение Государственного совета, Высочайше утвержденное 6 июня 1904 г. // ПСЗРИ. Собр. 3-е : в 33 т. – Т. 24 (1904). – Ч. 1. – № 24701. – С. 603–607.
22. *Таранович, К. Ю.* Деятельность землеустроительных комиссий по реализации столыпинской аграрной реформы в Беларуси (1906–1917 гг.) : дис. … канд. ист. наук : спец. 07.00.02 / К. Ю. Таранович. – Минск, 2016. – 239, [2] л.

9. Natsyyanalny gistarychny arkhiu Belarusi (NGAB). – F. 1595. Vop. 1. Spr. 85.
10. Imennoy Vysochayshiy ukaz, dannyy Senatu. – O dopolnenii nekotorykh postanovleniy deystvuyushchego zakona, kasayushchikhsya krestyanskogo zemlevladeniya i zemlepolzovaniya // PSZRI. – Sobr. 3-ye : v 33 t. – T. 26 (1906). – № 28528. – S. 970–974.
11. RDGA. – Fond 1291. Vop. 31, 1908. Spr. 6. Delo po revizionnym pismam d.s.s. Konstantina Konstantinovicha Stefanovicha za 1908 god.
12. Akt revizii, proizvedennoy Pinskim uyezdnym predvoditelem dvoryanstva I. A. Papa--Afanasopulo vo vtorom zemskom uchastke Pinskogo uyezda 5–7 i 16, 17, 26, 27 avgusta 1908 goda. – [Minsk, 1908].
13. RDGA. – Fond 1291. Vop. 122, 1909 g. Spr. 38. Delo o komandirovke pomoshchnika Upravlyayushchego Zemskim otdelom Deystvitelnogo statskogo sovetnika Stefanovicha v Vilenskuyu, Liflyandskuyu i Minskuyu gubernii dlya obrevizovaniya krestyanskikh uchrezhdeniy.
14. Rasiyski dzyarzhauny gistarychny arkhiu (RDGA). – Fond 1278. Vop. 6. Spr. 456. Delo po zakonoproyektu Ministerstva vnutrennikh del, vnesennomu v Gosudarstvennuyu Dumu Chetvertogo sozyva, ob uvelichenii okladov soderzhaniya nachalnikov i nepremennykh chlenov gubernskikh i gubernskikh po krestyanskim delam prisutstviy.
15. Natsyyanalny gistarychny arkhiu Belarusi u g. Grodna. – Fond 18. Vop. 1. Spr. 1797. Delo ob uchastii zemskikh nachalnikov v khode zemleustroystva krestyan Grodnenskoy gubernii.
16. Vysochayshe utverzhdennyy odobrennyy Gosudarstvennym Sovetom i Gosudarstvennoy Dumoy zakon. O zemleus_troystve // PSZRI. Sobr. 3-ye : v 33 t. – T. 31 (1911) – Ch. 1. № 35370. – S. 453–471.
17. Plan zemleustroitelnykh rabot na polevoy period 1914 goda: Mogilevskaya guberniya : v 3 ch. – Ch. 1: Dela v poryadke Polozheniya o zemleustroystve, naznachennyye k zemlemernomu ispolneniyu. – Mogilev-na-Dnepre : Tipo-litografiya Ya. N. Podzemskago, [1914]. – 83 [10] s.
18. Obzor Mogilevskoy gubernii za 1913 god / Mogilev. gub. stat. komitet. – Mogilev na Dnepre, 1915. – VI, 91, [137] s. : tabl.
19. Dokumenty i materialy po istorii Belorussii : v 4 t. T. 3 : 1900–1917 gg. / Akad. nauk Belorus. SSR. In-t istorii ; pod red. deystv. chl. AN BSSR V.N. Pertseva [i dr.]. – Minsk : Izd-vo Akad. nauk BSSR, 1953. – 1020 s.
20. Vysochayshe utverzhdennoye mneniye Gosudarstvennogo soveta. O dobrovolnom pereselenii selskikh obyvateley i meshchan na kazennyye zemli i o poryadke perechisleniya lits oznachennykh sosloviy, pereselivshikhsya v prezhneye vremya // PSZRI. Sobr. 3-ye : v 33 t. – T. 9 (1889). – № 6198. – S. 535–538.
21. Vysochayshe utverzhdennyye vremennyye pravila o dobrovolnom pereselenii selskikh obyvateley i meshchan-zemlevladeltsakh. Mneniye Gosudarstvennogo soveta, Vysochayshe utverzhdennoye 6 iyunya 1904 g. // PSZRI. Sobr. 3-ye : v 33 t. – T. 24 (1904). – Ch. 1. – № 24701. – S. 603–607.
22. *Taranovich, K. Yu.* Deyatelnost zemleustroitelnykh komissiy po realizatsii stolypinskoy agrarnoy reformy v Belarusi (1906–1917 gg.) : dis. … kand. ist. nauk : spets. 07.00.02 / K. Yu. Taranovich. – Minsk, 2016. – 239, [2] l.

Рэпазіторый БДПУ